


# Падарожжы з Саламеяй

***Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала віртуальны праект «Адысея Саламеі Русецкай: ад Стамбула да Пецярбурга», прысвечаны 300-годдзю з дня нараджэння гэтай цікавай асобы. Юбілей нашай знакамітай зямлячкі ўключаны ў Спіс памятных датаў ЮНЕСКА на 2018 год.***

Саламея Рэгіна Русецкая (у замужжы Пільштынова) – першая ў гісторыі Рэчы Паспалітай жанчына-лекар, асветніца, нястомная вандроўніца і мемуарыстка. Яна працавала пры расійскім і аўстрыйскім імператарскіх дварах, а таксама пры гарэме турэцкага султана.

Праект уяўляе сабой віртуальную вандроўку па гарадах і краінах, дзе падарожнічала Саламея, – гэта Стамбул, Вена, Нясвіж, Санкт-Пецярбург, Кіеў, Рыга і іншыя. У аснову пакладзеныя мемуары С. Русецкай, тая спадчына, што пасля яе засталася. Гэта кніга-дзённік з кваяцістай назвай «Рэха, на свет пададзенае, заняткаў, падарожжа і жыцця майго авантураў...». Арыгінал гэтага выдання пад назвай «Echo na świat podane procederu podróży i życia mego awantur...» знаходзіцца ў Музеі князёў Чартарыйскіх у Кракаве. У Беларусі кніга выйшла ў перакладзе Міколы Хаўстовіча пад назвай «Авантуры майго жыцця». Мемуары – крыніца па гісторыі і геаграфіі, дзе аўтар перадала свае ўспаміны і ўласныя разважанні наконт тагачасных падзеяў, адлюстравала цікавыя вобразы людзей, што сустракаліся ў час яе падарожжаў па краінах Захаду і Усходу. Шмат месца ў кнізе адведзена апісанню побыту і нораваў розных народаў, выкладзеныя метады лячэння розных хваробаў. Лекарка шмат у чым абапіралася на здабыткі народнай медыцыны, папулярызавала гігіену і здаровы лад жыцця.

Пазнаёміцца з праектам можна на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі www.nlb.by.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***